Таццяна ЛАЎРЫК

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ Ў ПРОЗЕ ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ

Вядомы майстар гістарычнага рамана — адзін з паслядоўнікаў Уладзіміра Караткевіча, які ў другой палове XX ст. шмат зрабіў для абуджэння гістарычнай памяці беларускага народа. Найбольшую вядомасць Леанід Дайнека атрымаў пасля выхаду яго гістарычных раманаў «Меч князя Вячкі» (1987), «След ваўкалака» (1988) і «Жалезныя жалуды» (1993). Творы пісьменніка вызначаюцца тэмамі, да якіх раней амаль не звярталіся ў беларускай літаратуры.

Маючы на ўвазе свае першыя гістарычныя раманы, Л. Дайнека адзначыў: «Падчас напісання твораў заканамерна склаўся цыкл гістарычных раманаў, хоць, калі быць шчырым, я напачатку не думаў пра такое. Проста пісаў і пісаў.

Пад родным небам добра й лёгка крочыцца.
Аддамся я шляхам, вытокам, нетрам.
Мне ў глыбіню стагоддзяў глянуць хочацца,
Нібы ў акно, расчыненае ветрам.

Я пісаў і думаў пра сваіх папярэднікаў — Язэпа Дылу, Барыса Мікуліча, Каруся Каганца. Я дыхаў разам з імі святым ветрам беларускай гісторыі» (архіў аўтара. — *Т. Л.*)[1].

Слушна сцвярджае А. Дарагакупец, што пісьменнік у згаданых раманах «гераізуе мінулае. Гэта хутчэй паэтычнае, рамантызаванае апісанне даўніны, якое здольна захапіць чытача і выклікаць у яго цікавасць да сваёй мінуўшчыны» [5, с. 37]. Сапраўды, героі яго твораў — князі Вячка, Усяслаў Чарадзей, Міндоўг — больш дбаюць пра народ, а не пра сябе. Назіраецца паэтызацыя мінулага — традыцыя, закладзеная У. Караткевічам.

Сёння вельмі запатрабаваныя творы, дзеянне ў якіх разгортваецца ў старадаўніх замках, магнацкіх палацах, а беларускім тыпажом героя-мужчыны з'яўляецца задуменны, самаіранічны, рамантычны рыцар. Таму ў свой час пісьменнік трапіў у плынь масавай літаратуры, калі стварыў вобраз такога персанажа. Першыя ж яго творы на гістарычную тэматыку цікавыя і сёння, бо сваім зместам яны блізкія моднаму ў сучаснай літаратуры раману-фэнтэзі.

У рамане «Меч князя Вячкі» Л. Дайнека звяртаецца да традыцый еўрапейскага рыцарскага рамана. Князь Вячка — беларускі рыцар, змагар за сваю краіну. Пісьменніку вельмі блізкі гэты герой, ён сам сябе атаясамліваў з ім: «Мне было сорак гадоў, калі ў маё сэрца (так-так, я адчуў гэта) упілася нейкая дужа гарачая,

[1]Архіў аўтара артыкула змяшчае лісты з асабістай перапіскі з Л. Дайнекам.

***Лаўрык Таццяна Анатольеўна,*** *магістр філалагічных навук, аспірант кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ. Навуковы кіраўнік: Верабей Анатоль Леанідавіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ.*

дужа вострая страла. Я паклаў усіх сваіх сямейнікаў спаць, зачыніўся ў кабінеце, запаліў святло, узяў у рукі асадку…

За векам век згарае,
Зірні ў начны блакіт.
Вунь маладзік над гаем,

Як князя Вячкі шчыт…» (архіў аўтара. — *Т. Л.*).

Для стварэння такога твора неабходна было звярнуцца да апісання рыцарскай культуры. Гэта тлумачыць і назва рамана, дзе найбольш важную ролю адыгрывае вайсковы атрыбут — меч, які выкавалі для князя.

У рамане «След ваўкалака» адлюстраваны самы трагічны перыяд жыцця знакамітага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Паланёны братамі Яраславічамі, ён сядзеў з сынамі ў порубе і ўжо не спадзяваўся на вызваленне. Кіяўляне вызвалілі князя з няволі, каб ён абараніў іх ад войскаў хана Шурукана. Пра паўстанне, якое паднялі месцічы, каб вызваліць Усяслава, згадваецца ў летапісе: «Пойдем, освободим дружину свою из погреба. <…> Люди же освободили Всеслава из темницы — 15 сентября — и прославили его среди двора княжеского» [9, с. 314—315]. Але пра княжанне Усяслава ў Кіеве, якое доўжылася 7 месяцаў, у летапісах не адзначана.

Леанід Дайнека змог ліквідаваць прабел у жыццяпісе полацкага князя, апісаць яго становішча ў зняволенні: «…на змрочным фоне кіеўскага поруба, а пазней не на менш змрочным фоне пакінутага вялікакняжацкага прастола, яшчэ ярчэй выяўляюцца тыя бліскучыя якасці Усяслава, якія сапраўды прыцягнулі да гэтага чалавека ўсю славу, зрабілі яго імя бессмяротным праз стагоддзі» [7, с. 299]. У пісьменніка князь Усяслаў — гэта мудры палітык, смелы воін, адукаваны чалавек.

Раман «Жалезныя жалуды» ўзнаўляе старажытныя часы гісторыі, пачатак Вялікага Княства Літоўскага і яго стваральніка, князя Міндоўга. У пісьменніка гэта не проста ўладар дзяржавы, але і вельмі жорсткі чалавек, для якога галоўнае — палітыка. Таму, у залежнасці ад сітуацыі ў краіне, князь некалькі разоў змяняе веру, не адчуваючы найменшых згрызотаў сумлення.

Раманы Л. Дайнекі пачатку XXI ст. можна лічыць працягам гістарычнага цыкла, бо падзеі, якія ён апісвае, знаёмяць з гісторыяй краіны, храналагічна набліжаюцца да XX ст.: «Назаві сына Канстанцінам» (XV—XVI стст.), «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» (XVII ст.), «Той, каго ўдарылі па шчацэ» (XVII ст.), «Ілоты» (XX ст.). У адрозненне ад папярэдніх твораў пісьменнік не проста апавядае пра падзеі пэўных гістарычных эпох. Гэтыя творы найбольш блізкія да фантастычнага жанру, значна адрозніваюцца ад першых гістарычных раманаў. Пачынаючы з «Мяча князя Вячкі», творы Л. Дайнекі можна было б аб'яднаць у адзін гістарычны раманны цыкл, у якім прасочваецца агульная мэта — адлюстраванне вобразаў дзяржаўных дзеячаў (Міндоўг, Усяслаў, Канстанцін Астрожскі, Канстанцін Вялікі і Канстанцін Палеалог, Леў Сапега). А. Марціновіч вызначае, што «ўсе раманы, хоць і не маюць паміж сабой прамой сувязі, тым не менш сваім зместам трапляюць пад агульны вызначальнік — "Апосталы дзяржаўнасці", а калі канкрэтней — "Апосталы беларускай дзяржаўнасці"» [8, с. 16].

На некаторы час Л. Дайнека спыніў свае пошукі ў асэнсаванні далёкай мінуўшчыны, аднак працягваў пісаць вершы, з якіх пачынаў свой шлях у літаратуру. І толькі ў 2010 г. выйшаў з друку чарговы раман, прысвечаны Аршанскай бітве 1514 г. — «Назаві сына Канстанцінам», які адразу выклікаў гучны рэзананс (часопісная публікацыя: «Маладосць», 2008, № 4—8).

У рамане назіраецца двухпланавасць сюжэта. Падзеі адбываюцца ў розныя гістарычныя часы ў адным тэксце, аб'яднаны імем Канстанцін, якое носяць вядомыя людзі ў гісторыі: Канстанцін Святы — заснавальнік Канстанцінопа-

ля, які зрабіў хрысціянства асноўнай рэлігіяй у Рымскай імперыі; Канстанцін Палеалог — апошні візантыйскі імператар, абаронца веры ад мусульманскіх полчышчаў. Астрожскаму наканавана стаць трэцім Канстанцінам: «Толькі ён можа магутным ударам адкінуць ад нашых межаў маскоўскія раці, абараніць нашу дзяржаву» [3, с. 281]. З вуснаў аднаго з герояў рамана, які надзелены здольнасцямі празорцы, прамаўляецца пра нараджэнне яшчэ двух Канстанцінаў, якія змогуць паўплываць на гісторыю Беларусі ў будучым, — Кастуся Каліноўскага і Канстанціна Міцкевіча (Якуба Коласа). Тут бачым сувязь стагоддзяў, пісьменнік быццам аб'ядноўвае папярэднія перыяды гісторыі, праводзіць паралелі, спрабуе вызначыць перыядычнасць у адстойванні ідэі незалежнасці і свабоды краіны, прыгнечанай іншымі дзяржавамі.

Твор падзелены на часткі, якія апавядаюць пра розныя гістарычныя эпохі: у першай падзеі адбываюцца ў Італіі ў 1452 г. Потым героі Марцін Жабыка-Жэмба і яго каханая Зося Еўрапейка трапляюць праз «хронадзірку» ў старажытны Рым, у 312 г. — часы Канстанціна Вялікага, імператара Рымскай імперыі, які пабудаваў у сталіцы Святую Сафію. Праз увесь раман праходзіць гісторыя існавання Ордэна святога Палямона, змаганне яго членаў за волю і незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага.

Падзеі другой часткі рамана адбываюцца ў Вялікім Княстве Літоўскім у 1507 г., прысвечаны асобе Канстанціна Астрожскага і Аршанскай бітве 1514 г. Пісьменнік так характарызуе князя: «Наша сіла і слава. Наш Ганібал. Самааддданы, нязломны ваяр за хрысціянства і наш край» [3, с. 281].

У гістарычнай прозе цяпер адбываецца пошук новых пісьменніцкіх стратэгій, для некаторых аўтараў гэта заканчваецца адыходам ад гістарычнай праўды і пераходам да альтэрнатыўнай рэальнасці [1]. Існаванне Ордэна святога Палямона і князя Палямона ў рамане можна было б палічыць альтэрнатыўнай гістарычнай рэальнасцю, але інфармацыя пра Палямона і легенда пра паходжанне ад рымскай шляхты літоўскіх князёў адлюстравана ў «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай».

На працягу некалькіх гадоў на аўтарскім сайце Л. Дайнекі з'явіліся новыя раманы — «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка», «Той, каго ўдарылі па шчацэ» і «Ілоты».

Раман «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» («Дзеяслоў», 2010, № 1—3) распавядае пра часы праўлення Жыгімонта III Вазы: вайна са Швецыяй, міжусобныя войны магнатаў, частка якіх не прымала палітыку караля, падтрымка Лжэдзімітрыя I і II, да якіх з мэтай дапамогі ўсталявання на пасадзе выйшлі войскі Рэчы Паспалітай.

Аляксандр Язэп Лісоўскі — адзін з цэнтральных герояў твора, узначаліў лёгкую беларускую кавалерыю — лісоўчыкаў, якія ўваходзілі ў склад ліцвінскага войска, падтрымалі Лжэдзімітрыя, спрабавалі адваяваць для яго трон Маскоўскага княства, на які ўжо ўзышоў Васіль Шуйскі.

За заслугі ў бітве пад Кірхольмам Лісоўскі быў узнагароджаны Жыгімонтам III Вазам, атрымаў чын каралеўскага палкоўніка. Пасля бунту Зэбржыдоўскага супраць караля, асуджаны на выгнанне Аляксандр Лісоўскі ўступае ў войскі Лжэдзімітрыя II пад кіраўніцтва Яна Сапегі. Становіцца палкоўнікам і ўзначальвае харугву. Колькасць людзей пад яго сцягам расла, далучаліся жыхары Маскоўскай дзяржавы, урэшце харугва налічвала да 3000 асоб. Гэта былі прадстаўнікі розных саслоўяў — шляхта, мяшчане, сяляне, якія жылі з вайны, імкнуліся стаць вольнымі і атрымаць шляхецтва за ваенныя заслугі [10].

Найбольшую ўвагу надае аўтар апісанню аблогі войскамі Яна Сапегі, куды ўваходзіў і полк Лісоўскага, Троіца-Сергіевай лаўры, што з'яўлялася асяродкам змагання супраць Лжэдзімітрыя і рыма-каталікоў. Аўтар тлумачыць аблогу манастыра знаходжаннем у ім святыняў Ордэна святога Палямона — Залатога Чоўна Палямона і Ключоў ад Трох Рэкаў.

Непараўнаныя ў кавалерыйскіх сечах і безагляднай мужнасці, лісоўчыкі вылучаліся жорсткасцю, авантурызмам і прагаю здабычы, таму іх называлі беззаконнымі. І такія звычкі пераймалі ўсе новапрыбыўшыя. Нягледзячы на гэта, пісьменнік рамантызуе іх, надаючы ім рысы нацыянальных змагароў.

Раман «Той, каго ўдарылі па шчацэ» (2018; электронная бібліятэка Янушкевіча) займае асобнае месца ў творчасці Л. Дайнекі, звязаны з асабістымі зменамі ў адносінах да рэлігіі самога аўтара. У 2004 г. ён быў ахрышчаны ў каталіцкую веру, а свой новы твор прысвяціў Язафату Кунцэвічу — вялікалітоўскаму царкоўнаму і палітычнаму дзеячу, уніяцкаму святару, які быў забіты ў 1623 г. у Віцебску. Аўтар звяртаецца да неадназначнага вобраза галоўнага героя, які выклікаў супярэчлівыя стаўленні да яго прыхільнікаў розных веравызнанняў: «Я пачаў пісаць гэтую кнігу дзеля рэабілітацыі Язафата Кунцэвіча. <…> Зазначу, што мой герой ужо даўно рэабілітаваны — каталіцкі касцёл аб’явіў яго святым пакутнікам за веру» [5].

У апошнім гістарычным рамане «Ілоты» (2018) Л. Дайнека адлюстроўвае некалькі гістарычных перыядаў: Месенскае паўстанне ў Спарце (7 ст. да н. э), першыя гады пасля Вялікай Айчыннай вайны, Слуцкае паўстанне і нацыянальны рух на Беларусі ў 20-я гг. ХХ ст.

Ілоты — земляробы старажытнай Спарты, якіх заваявалі дарыйцы. Ад рабоў адрозніваліся тым, што валодалі сродкамі вытворчасці, вялі сваю гаспадарку, уласнікі ўчасткаў не маглі іх ні прадаваць, ні забіваць. Жорсткая эксплуатацыя выклікала паўстанні ілотаў, самае буйное з іх — 2-я Месенская вайна. З гэтым народам старажытнай Спарты аўтар параўноўвае прыгнечаны беларускі народ. Дайнека перадае рэаліі жыцця калгаснай моладзі і сталага насельніцтва, вельмі адрозныя ад побыту гараджан у 50-я гг. ХХ ст. Адсутнасць пашпартнай сістэмы на вёсцы рабіла яе жыхароў такімі ж ілотамі.

Пры дапамозе дзённіка Ганны Доўгерд, нявесты атамана «Зялёнага Дуба», аўтар маштабна ўзнаўляе падзеі Слуцкага паўстання, адлюстроўвае рэальных гістарычных асоб: кіраўнікоў антыбальшавіцкай ваенна-палітычнай арганізацыі «Зялёнага Дуба» Вячаслава Адамовіча-старэйшага і Вячаслава Адамовіча-малодшага (Дзяргача), генерала С. Булак-Балаховіча, З. Гіпіус і іншых. Такім чынам, пісьменнік адзначае, што ў розныя часы людзі падымаліся на барацьбу, каб палепшыць жыццё і аднавіць дзяржаву.

У 2018 г. быў надрукаваны і апошні аўтабіяграфічны твор — «Сын ільва, дачка Зеўса — Леанід і Зінаіда», які, па словах самога аўтара, выйшаў скарочаным, не трапілі ў друкаваную версію гістарычныя падзеі, якія Л. Дайнека апісаў у сваім рукапісе[1]. Пры іншым раскладзе твор мог быць далучаны таксама да гістарычнай прозы.

Змены ў падыходзе да гістарычнай прозы ў ХХІ ст. паўплывалі на фарміраванне новага стылю Л. Дайнекі. «Назаві сына Канстанцінам», «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» — рамантычныя гістарычныя дэтэктывы, якія маюць прыкметы прыгодніцкіх раманаў, а таксама блізкія і да фантастычнага жанру. «Ілоты» — спалучэнне розных жанраў, з элементамі дэтэктыва, прыгодніцкага рамана і інтэлектуальнай прозы. Пісьменнік спрабуе сябе ў розных жанрах, пераплятаючы іх элементы, з мэтай стварэння гістарычнага твора, які будзе выклікаць цікавасць не толькі ў гісторыкаў. У творах Л. Дайнекі назіраецца пранікненне падзей і герояў з аднаго твора ў другі. Напрыклад, праз усе творы праходзіць род Жабыка-Жэмбаў, які мае непасрэднае дачыненне да Ордэна святога Палямона.

З’яўляецца новы элемент, які ўводзіць аўтар у сваіх раманах — рэклама. Пісьменнік — заснавальнік фірмы «БелПІ», якая пачала выпускаць настойку «Крамбамбуля». У рамане «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» героі п’юць крамбамбулю, традыцыйны напой шляхты Вялікага Княства Літоўскага. Гэта звязана з раскруткай брэнда, а таксама з далучэннем да традыцый продкаў. Цяпер у нека-

[1] З лістоў Л. Дайнекі да аўтара артыкула.

торых даследчыкаў узнік недавер да сапраўднасці гэтага факта, але адказ на гэтае пытанне дае «Старадаўняя беларуская кухня» (1995) Э. Зайкоўскага і Г. Тычкі, куды ўвайшоў і старажытны рэцэпт крамбамбулі.

Гістарычная проза Леаніда Дайнекі арыгінальная. Аўтар зацікавіў чытача, стварыў дасканалыя гістарычныя партрэты, пераканаўча вытлумачыў паводзіны сваіх герояў. Ён звяртаўся да важных перыядаў у гісторыі Беларусі, запаўняў белыя плямы, якія з ідэалагічных прычын раней абміналіся пісьменнікамі.

## Спіс літаратуры:

1. Бязлепкіна, А. П. Містыфікацыі ў сучаснай беларускай літаратуры / А. П. Бязлепкіна // Чтение: рецепция и интерпретация : сб. науч. ст. : в 2 ч. / М-во образов. Респ. Беларусь ; Гродн. госуд. ун-т. — Гродно, 2011. — Ч. 1. — С. 353—360.

2. Дайнека, Л. Выбраныя творы / Л. Дайнека. — Мінск : Беларус. навука, 2018. — 604 с. — (Беларускі кнігазбор : БК. Серыя I. Маст. літ.).

3. Дайнека, Л. Назаві сына Канстанцінам : раман / Л. Дайнека. — Мінск : Літ. і Маст., 2010. — 446 с. — (Святло мінуўшчыны).

4. Дайнека, Л. Пра лісоўчыка, злога хлопчыка : раман / Л. Дайнека // Дзеяслоў. — 2010. — № 1. — С. 15—75; № 2. — С. 13—76; № 3. — С. 13—66.

5. Дайнека, Л. Той, каго ўдарылі па шчацэ / Л. Дайнека [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://kniharnia.by/catalog/gistarychnaya_proza/toy_kago_daryli_pa_shchatse/. — Дата доступу : 15.01.2020.

6. Дарагакупец, А. М. Тэндэнцыі рамантызацыі інтэлектуалізацыі ў сучаснай беларускай гістарычнай прозе : дыс. … канд. філ. навук : 10.01.01 / А. М. Дарагакупец. — Мінск, 2005. — 120 л.

7. Кавалюк, А. С. Вобраз полацкага Усяслава ў «Слове пра паход Ігаравы» і ў рамане Л. Дайнекі «След ваўкалака» / А. С. Кавалюк // Шостыя рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., прысвеч. 85-годдзю з дня нараджэння У. А. Калесніка, Брэст, 26 кастр. 2007 г. «Слова аб палку Ігаравым» у літаратуры і духоўнай культуры славянскіх народаў : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Брэст, 27—28 крас. 2007 г. — Брэст, 2008. — С. 297—300.

8. Марціновіч, А. Плывец па рацэ гісторыі / А. Марціновіч // Дайнека, Л. Выбраныя творы / Л. Дайнека. — Мінск : Беларус. навука, 2018. — С. 5—18.

9. Повесть временных лет / подгот. текста і пер. Д. С. Лихачева ; под ред. чл.-кор. АН СССР В. П. Адриановой-Перетц. — Л. ; М. : изд. и 1-я тип. Изд-ва Акад. наук СССР в Лгр., 1950. — Ч. 1. — 404 с.

10. Wisner, H. Lisowczycy / H. Wisner. — Warszawa, 1995. — 153 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 31 студзеня 2020 года.

## Рэзюмэ:

**Таццяна ЛАЎРЫК**

**Актуалізацыя гісторыі ў прозе Леаніда Дайнекі**

УДК 821.161.3.09(092)+821.161.3.09-311.6

У артыкуле разглядаецца творчая спадчына майстра гістарычнай прозы Леаніда Дайнекі. Прыкметнай з’явай у беларускай літаратуры канца XX ст. сталі яго гістарычныя раманы «Меч князя Вячкі» (1987), «След ваўкалака» (1988), «Жалез-

ныя жалуды» (1993). Прааналізаваны раманы «Назаві сына Канстанцінам» (2010), «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» (2010), «Той, каго ўдарылі па шчацэ» (2018), «Ілоты» (2018), недастаткова даследаваныя ў літаратуразнаўстве.

**Ключавыя словы**: беларуская проза канца XX — пачатку XXI ст., гістарычная проза, раманны цыкл, вобразы, праблематыка, стыль, летапісна-хранікальныя сведчанні, мастацкая фантазія пісьменніка.

## Summary

**Tatsiana LAURYK**

## Actualization of history in prose of Leanid Dajnieka

The article discusses the creative heritage of the master of historical prose Leanid Dajnieka. His historical novels «Mieč kniazia Viački» (Sword Prince Vyachko, 1987), «Śled vaŭkałaka» (A trace of the werewolf, 1988), «Žaleznyja žałudy» (Iron acorns, 1990) became a notable phenomenon in Belarusian literature of the late XX century. The author's novels of the beginning of the XXI century «Nazavi svajho syna Kanstantynam» (Name your son after Kanstantyn, 2010), «Pra lisoŭčyka, złoha chłopčyka» (About lisoŭčyk, the angry guy, 2010), «Toj, kaho ŭdaryli pa ščace» (The one who was beaten on the cheek, 2018), «Iłoty» (The helots, 2018) that have not been fully studied in literary criticism were analysed.

**Keywords**: Belarusian prose of the late XX — early XXI century, historical prose, the novel cycle, images, problematics, style, chronicle evidences, writer's artistic fantasy.